- БЕЛАРУСКАЯ МОВА
- ENGLISH

# МАР'ІНА ГОРКА

ЕЎРАПЕЙСКІ ГОРАД




# Мар'іна Горка




Мар'іна Горка, горад, цэнтр Пухавіцкага раёна, за 65 км на паўднёвы ўсход ад Мінска. Вядома з XVI ст. Належала Радзівілам, Бужынскім, Ратынскім. З 27.09.1938 г. гарадскі пасёлак, з 22.07.1955 г. горад. На 1.01.2002 г. 32 200 жыхароў.

ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА!

Мар'іна Горка

## Чыгуначны вакзал

Пачынаем наша падарожжа як звычайна з вакзала. Ён знаходзіцца на Лібава - Роменскай чыгунцы, якая ў 1873 годзе звязала паміж сабой тэрыторыі сучасных Прыбалтыкі, Беларусі і Украіны. У тым жа годзе была заснавана ў Мар’інай Горцы чыгуначная станцыя «Пухавічы».






# Мар'іна Горка

# Сядзіба графа Макава



**Чаму так называецца кніжка?**
**Дзяцька Якуб ездзіў на пісьменніцкі кангрэс у Парыж. Яго сябар Кандрат Крапіва па гэтаму поваду напісаў эпіграму, удала раскрыўшы коласаўскую душу:**

Быў я ў Парыжы на кангрэсе –
То ў Загібельцы, браце, лепш:
Грыбоў няма ў Булонскім лесе,
А ў Сене – хоць бы адзін лешч.

**Якубу Коласу спадабаўся Кандратаў жарт, ён неўзабаве адказаў:**



Быць можа, я крыху дзівак,
Але люблю я Загібельку:
Там кожны хвойнік мне сваяк,
Там ясным днём надрэчны гак
Мне суліць мяккую пасцельку...

Калі агледзіш хвайнякі
І гэты кут пазнаеш бліжай,
Збіраючы баравікі, -
То вывад я раблю такі:
Мне Загібелька лепш Парыжа.

У савецкі час у гэтым будынку быў Дом творчасці пісьменнікаў Беларусі. Адпачываў тут і вядомы беларускі паэт Якуб Колас, для якога Пухавіччына стала другой Радзімай. Вывучэннем коласаўскай спадчыны на Пухавіччыне займаўся выпускнік сярэдняй школы №1 нашага горада Браніслаў Зубкоўскі. Ён напісаў кніжку дзіцячых апавяданняў...

Граф Макаў быў міністрам унутраных спраў Расійскай імперыі. Дзякуючы яму Лібава – Роменская чыгунка прайшла праз Мар'іну Горку, а не праз мястэчка Пухавічы, як планавалася спачатку. Граф даў хабар будаўнікам і тыя змянілі напрамак пракладкі так, каб дарога прайшла праз вёску Мар'іна Горка і яго маёнтак. А назва станцыі так і засталася як у праектных дакументах - "Пухавічы".

Мар'іна Горка

**Сядзіба графа Макава**

**Стары будынак школы**

**Сярэдня**





Доўнар Уладзімір Сідаравіч, прафесар, доктар біялагічных навук. У 2004 годзе Кембрыджскім універсітэтам у Англіі прызнаны выдатным навукоўцам XX стагоддзя. Там жа у яго гонар выдадзены медаль.

У гэтым годзе школа адзначае сваё сямідзесяцігоддзе. Школа славіцца сваімі выпускнікамі, вядомымі не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі.



Кембрыдж



1937




Астапчык Станіслаў Аляксандравіч, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства і фізікі металаў, акадэмік АН Беларусі, член-карэспандэнт. Доктар тэхнічных навук, прафесар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. З 1960 года працуе ў Фізіка-тэхнічным інстытуце АН Беларусі. Яго навуковыя працы па матэрыялазнаўству вядомы далёка за межамі Беларусі.






# Стары будынак школы

Ся



лассе. Больше все-
ть длинные дистан-
тров, 1 000 м. При-
пу Владимир Кон-
ч Казанцев, кото-
ожил заниматься в
кой атлетики. Запи-
го человек, в том
Так я первый раз
ал, что такое
ходьба.
нрави-
инте-

мательному ко мне отноше-
нию.

**И какой результат был в Краснодаре?**

Летом был уже пятым.

тижение страны у
ди взрослых, пя
тикилометровы
зок пересекал
же вр
спорт
ходьбо
ствен

Мелешкевіч Артур, майстар спорта Міжнароднага класа па спартыўнай хадзьбе. Пачаў займацца спортам з 11 гадоў у СШ №1. Бронзавы прызёр Чэмпіянату Света сярод юніёраў (1994г. Партугалія), 3 месца на Чэмпіянаце Еўропы сярод моладзі (1997 г. Фінляндыя), пераможца Кубка Еўропы (1998 г. Славакія), 2 месца на Кубку Свету (2002 г. Італія), 3 месца на элітным турніры мацнейшых хадакоў Свету (2001 г. Польшча). Занесены ў даведнік двадцаці мацнейшых атлетаў Свету.



Артур Мелешкевіч у сценах роднай школы на яе 70-гадовым юбілеі






## Стары будынак школы




Тамара Агеўніна, мастак-мадэльер, мастацтвазнаўца, член міжнароднай федэрацыі мастакоў пры ЮНЭСКА, удзельнік паказаў у Парыжы, Брусэлі, Люксембурзе, Празе, Берліне.





## Стары будынак школы

## Пухавіцкі лясгас





Вытворчасць лясгаса карыстаецца вялікім попытам як на ўнутраным, так і на знешнім рынку. Яна экспартуецца ў Расію, Польшчу, Літву, Латвію, Фінляндыю, Германію, Бельгію, Італію, Іспанію, Англію і іншыя краіны. Напрыклад, за 2005 год лясгасам рэалізавана на экспарт круглых лесаматэрыялаў на 446 000 $, піламатэрыялаў на 320 000 $.

Мар'іна Горка






Асноўная колькасць жыхароў нашага горада – хрысціяне. Ёсць сярод іх і прыхільнікі такіх тыпова заходнееўрапейскіх напрамкаў хрысціянства, як пратэстанцтва і каталіцызм.





## Пратэстанцкая царква



**касцёл**

**Замак**

Спрабуем мы дагнаць Заходнюю Еўропу і па колькасці замкаў. Напрыклад, у гэтым замку хутка размесціцца сучасны бізнэс-цэнтр.

Мар'іна Горка




**Герман Гмайнер**
**шыльда на офісным будынку вёскі**

*“У той дзень, калі мы з усёй адказнасцю здолеем сказаць, што ўсе дзеці планеты – нашы дзеці, на Зямлі ўсталюецца мір”.*

Гэтыя словы Германа Гмайнера, бацькі-заснавальніка SOS-дзіцячых вёсак, размешчаны на шыльдзе з яго партрэтам на офісным будынку вёскі.

Адным з праектаў, які рэалізаваны нямецкім і нарвежскім урадамі з’яўляецца SOS-дзіцячая вёска ў Мар’інай Горцы. Адкрыта вёска ў 2005 годзе.

**SOS-дзіцячая вёска**

# Мар'іна Горка



Мемарыяльны комплекс у 1982 годзе пабудавалі самі вайскоўцы. Ён прысвечаны баявому шляху 8-га гвардэйскага танкавага корпуса. Брыгады гэтага корпуса ўдзельнічалі ў вызваленні Еўропы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Іх баявы шлях пралёг праз еўрапейскія гарады Люблін, Варшава, Данцыг і іншыя.






Комплекс быў пабудаваны ў пачатку 90-х гадоў для сем’яў вайскоўцаў, выведзеных з былых сацыялістычных краін Еўропы. Фінанансаваў будаўніцтва нямецкі ўрад, а рэалізацыяй праекта займалася фінская кампанія. Калі будаўніцтва завершылася, мясцовыя ўлады вырашылі назваць гандлёвы цэнтр новага комплексу ў гонар сталіцы будаўнікоў “Хельсінкі”.

## Вайсковы м[illegible]комплекс

## Жылы комплекс “Новая Заря”




Ігар Лучанок з "Песнярамі"

Вядомую песню "Мой родны кут" задушэўна і шчыра выканаў ансамбль "Песняры". Разам з ім яна аб'ехала амаль увесь свет. Гэтай песняй Ігара Лучанка заслухоўваліся ў Польшчы і Германіі, Венгрыі і Чэхіі, Швейцарыі і Румыніі.

Наш зямляк, вядомы беларускі кампазітар Ігар Лучанок, пабываў больш чым у шасцідзесяці краінах свету. І там гучалі яго песні. Па іх людзі іншых зямель адкрывалі для сябе Беларусь і беларусаў.

Криница

Северный

Заречье

Юго-Запад-2

**Бацькоўскі дом Ігара Лучанка**

**Жылы комплекс "Новая Зара"**

**Гучыць песня "Мар'іна Горка" на музыку Ігара Лучанка**

Мар'іна Горка

Палац культуры



“Забава”

У гэтым палацы займаюцца творчасцю мастацкія калектывы “Пухаўчанка” і “Забава”. Яны часта выязджаюць на гастролі ў іншыя краіны, дзе прапагандуюць нашу нацыянальную беларускую культуру. Іх ўжо ведаюць у Францыі, Польшчы, Фінляндыі, Германіі.

Мар'іна Горка






На сцэне гэтага палаца атрымала свой першы тытул “Міс Мар’іна Горка” Юлія Сіндзеева. Потым наша прыгажуня стала “Віцэ-міс Беларусь” і ўдзельнічала ў конкурсе “Міс Еўропа”, на якім заняла 4 месца.

# Палац культуры




У мастацкай галерэі, якая знаходзіцца ў палацы, экспануюцца карціны розных мастакоў. Сярод іх Гоманаў Леанід Міхайлавіч, які пэўны час жыў і працаваў у нашым горадзе. Зараз яго творы знаходзяцца ў галерэях і прыватных калекцыях у Славакіі (галерэя “Міро”), Польшчы, Германіі, Францыі, Нарвегіі, Даніі.



Карціна Л. Гоманава “Прасторы Славакіі”

## Рэстаран "Версаль"

## Палац культуры




А на прыканцы нашага падарожжа запрашаем Вас у наш мясцовы "Версаль". Канешне, гэта не каралеўская рэзідэнцыя, але падаюць тут стравы, вартыя каралеўскага стала. Тут мы звычайна прымаем гасцей нашага горада.

Мар'іна Горка




# Мар'іна Горка




Вось і скончылася наша невялічкае віртуальнае падарожжа. Спадзяемся, што яно дало Вам магчымасць пазнаёміцца з нашым горадам. Запрашаем Вас у госці. Да сустрэчы!

Аўтары праекта:

Барыс Муха

Сяргей Качура

Еўрапейскі клуб сярэдняй школы №1
г. Мар'на Горка

Лістапад 2007

У праекце гучыць музыка:

Томаса Ньюмана

Ігара Лучанка

Джона Уільямса

Яна Тырсана

Moby

De-Phazz

● ВЫБАР МОВЫ

ДЛЯ ВЫХАДУ НАЦІСКАЙЦЕ ESCAPE

# MARINA GORKA

THE EUROPEAN TOWN






# Мар'іна Горка

# LET'S TAKE A TRIP WITH US!




Marina Gorka, the town, the center of Puhavichi District which is situated sixty-five kilometers to the South East from Minsk. It dates back to the XVI century. The territory of the town belonged to Radzivil, Buzhinski and Ratinskiy. On the 27 th of September in 1938 it became a settlement. On the 22 nd of June in 1955 the settlement was given an official status of a town. On the first of January in 2002 there were 32 000 inhabitants.

# The Railway Station

We are going to start our journey from the railway station as usually. It is situated on the Libava-Romenskaya railway line. The railway line was built in 1873 and connected Belarus with the contemporary territories of Baltic States and Ukraine. The railway station Puhavichi was founded in the same year.






Мар'іна Горка

# Count's Makau Estate



Why is the book called in such a way?

The thing is that Yakub Kolas went to the writers' congress to Paris. His friend Kandrat Krapiva wrote an epigram on the account of it. In the epigram he managed to reveal Yakub Kolas' inner feelings and soul. In the epigram Krapiva wrote that Kolas admired the beauty of the Belorussian nature and landscape. Finally Krapiva came to the conclusion in his epigram that the land of Belarus appealed Kolas more than Paris. It was certainly done for the sake of fun.

Yakub Kolas liked Kandrat's joke and soon Yakub Kolas made a reply in verses. In the reply Y.Kolas wrote that some people might consider him a strange person but nevertheless he emphasized the idea that the Belorussian nature and landscape appealed him most of all. He also added that the beauty of his motherland couldn't be compared with anything else.

Count Makau was a member of the ... Internal Affairs of the Russian Empire. Because of his activity the L'ibava-Romny railway was built across the territory of Marina Gorka but not across the territory of Puhavichi settlement as it had been initially planned. Count Makau gave a bribe to the railroad builders in order to make them change the direction of the railroad line so as the line goes across his territory. The Marina Gorka ... estate. But the name of the station remained the same as in the construction documents- Puhavichi.

During the existence of the Soviet Union there was a so called "Writers' Creative Activity House" in the building of count's Makau former estate. A famous Belorussian poet Yakub Kolas used to stay there. One should mention that [illegible] his second motherland. The literary activity of Yakub Kolas was studied and analysed by the school teacher of the secondary school #1 Branislau Zhuk. He wrote a book of children's stories "Why is Zahlbelka better than Paris?"





# Count's Makau Estate

# The old School building

# Seconda





Dounar Uladzimir Sidaravich, Professor, doctor of the Biological Sciences. High-ranking officials of the Cambridge University acknowledged him the outstanding scientist of the XX century. A special medal was made in his honour.

This year the school marks its 70 th anniversary. The school is famous for its school leavers, that are well-known in Belarus and abroad as well.



Cambridge



1937








Astapchik Stanislau Alexadravich, Belorussian scientist in the sphere of physics of metals and material making, academician, Fellow of the Academy of Sciences of the Republic of Belarus. Doctor of technical sciences, was awarded with the State Prize of the USSR. Since 1960 he has been working in the Phisics-Technical Research Institute of the Academy of Sciences of the Republic of Belarus. Scientific works of this scientist are well-known abroad.






# The old School building






Meleshkevich Arthur, Master of Sports of the International Classification, specializes in walking-race. Arthur began training at the age of eleven at school #1 in Marina Gorka. He was awarded with a bronze medal at the Youth Walking-Race Competition (1994, Portugal); got the third Prize at the European Youth Championship (1997, Finland); became winner of the Cup of Europe (1998, Slovakia); got the second Prize at the Cup of the World (2002, Italy); got the third Prize at the elite competition of the strongest walking- racers (2001,Poland). His name was included into the reference book of the twenty strongest athletes of the world.






# The old School building



In Brussels

Tamara Ageunina, an artist, a clothes model-maker, a member of the UNESCO international artist federation, a participant of fashion shows in Paris, Brussels, Luxemburg, Prague, Berlin.





# The old School building
# Puhavichi Forestry





Production of the forestry is in a great demand on the internal and the external markets. The production is exported to such countries as Russia, Poland, Lithuania, Latvia, Finland, Germany, Belgium, Italy, Spain, England and others. For instance in 2005 the forestry sold timber materials at the total amount of $460 000 and saw materials were sold at the total amount of $320 000.

Мар'іна Горка








Most of the town’s residents are Christians. Some of the people confess typical West European branches of Christianity such as Protestantism and Catholicism.








We are trying to keep in step with the West European countries and to have as many castles as in Western Europe. For instance, in the nearest future a business center will be opened in this castle.



German Gmayner

*“As soon as we assume the responsibility to say that all children on the planet are our children, there will be peace everywhere on the Earth”*
These words belonged to German Gmayner, the founder of SOS-Kinderdorf. His words are written on the memorial plate on the wall of the Kinderdorf office building.

One of the projects which has been realized by the German and Norwegian governments was the creation of a SOS-Kinderdorf (The Childrens' village). The village was opened in 2005.

**SOS- Kinderdorf (the Childrens' village)**



The Military Memorial Complex was created by the military men themselves. It is dedicated to combat itinerary of the 8th Guards tank corps during the Second World War. Brigades of this corps liberated Europe from the Nazi invaders. The itinerary of this corps went across such European cities as Lublin, Warsaw and Danzing.









The complex was built in early 1990s for the families of military men who had come back from former socialist states of Europe. The building was financed by the German Government. A Finnish company took the responsibility to realize the project. When the building was completed, the local authorities decided to call the new trading center in the residential area in honour of the builders' capital - Helsinki.

**The Military Memorial Complex**

**The Residential complex "Novaya Zarya"**

Our fellow-countryman, a famous Belorussian composer Igar Luchanok has visited more than sixty countries and his songs were performed in those countries. Thanking to those songs foreign citizens got to know about Belarus and Belorussians.

A famous song “My Native Land” was sincerely performed by “Pesnyary” group. This song could be heard in every country the composer went to. People enjoyed listening to this song in such countries as Poland, Germany, Hungary, Czech, Switzerland and Roumania.



Igar Luchanok with “Pesnyary”






# The Palace of Culture

"Zabava"

Folk groups "Puhauchanka" and "Zabava" practise singing and dancing in this building. They often go on tours to foreign countries and give people a chance to get acquainted in such a way with Belorussian folk culture and traditions. These folk groups are well-known in France, Poland, Finland and Germany.



On the stage of this palace Julia Sindzeeva got her first title “Miss Marina Gorka”. After that this beautiful girl got a title “Vice Miss Belarus”, she also participated in “Miss Europe” beauty contest and got the fourth prize.

Мар'іна Горка

# The Palace of Culture



Gomanau's painting "The Scope of Slovakian Landscape"

In the Art Gallery (it is situated in the building of the Palace of Culture) paintings of different artists are exhibited. Gomanau Leanid Mihailavich is one of them. He used to live and work in our town for a certain period of time. Now his paintings are exhibited in art galleries and could be found in private collections in Slovakia ("Miro" gallery), Poland, Germany, France, Denmark and Norway.

# Restaurant "Versailles"

# The Palace of Culture




At the end of our journey we would like to invite you to our local "Versailles". It is not a royal residence of course, but the food served here is as delicious as royal one. Here we usually receive guests of our town.

Мар'іна Горка




# Мар'іна Горка




So our little virtual trip is over. We hope that it has given you a possibility to get acquainted with our town. We cordially invite you to visit us. Good buy!

The authors of the project:

Boris Mukha

Sergey Kachura

Translation: Uladzimir Tatarnikau

European Club of Secondary School#1,
Marina Gorka

November 2007

In the project one can hear music composed by:

Thomas Newman

Igar Luchanok

Jhon Williams

Yann Tiersen

Moby

De-Phazz